

ДА АДУКАЦЫІ Ў «ЛІЧБЕ» 7

ЗНАЙСЦІ «ВЫЙСЦЕ» Ў МІНСКУ 8



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

21 СНЕЖНЯ 2019 г. СУБОТА № 243 (29110)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Анатоль ГЛАЗ, прэс-сакратар Міністэрства замежных спраў:**

*«Мы жывём не на Месяцы і атрымліваем зарплату ў беларускіх рублях. Таму выдатна разумеем, што азначае сума 80 еўра для грамадзян нашай краіны, якія знаходзяцца на першым месцы ў свеце па колькасці выдадзеных шэнгенскіх віз. У сувязі з гэтым мы заклікалі еўрапейскі бок знайсці магчымасць прыняцця ім палітычнага ці юрыдычнага рашэння для таго, каб не павышаць, «замарозіць», тарыфы за выдачу шэнгенскіх віз беларускім грамадзянам пасля пачатку прымянення новага Візавага кодэкса ЕС аж да ўступлення ў сілу пагаднення паміж Беларуссю і ЕС аб спрашчэнні выдачы віз. Субстантыўнай рэакцыі мы пакуль не атрымалі, але хочацца верыць, што пытанне разглядаецца».*

# ПАЕЗДКА — РАБОЧАЯ, ВЫНІКІ — ПЛЁННЫЯ



Фота БелТА.

## Значны прагрэс у пошуку кампрамісу

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ўчора ў Санкт-Пецярбургу прыняў удзел у пасяджэнні Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета. Але спачатку былі паўтарагадзінныя перагаворы з расійскім калегам. Мяркуючы па словах, якія былі сказаныя прэзідэнтамі ў прысутнасці журналістаў, суразмоўнікі імкнуліся дасягнуць максімальна станоўчага выніку. Аляксандр Лукашэнка адзначыў каласальны прагрэс у развіцці супрацоўніцтва з Расіяй, у тым ліку па лініі саюзнага будаўніцтва. «Чамусьці мы не заўсёды і не ўсё гаворым, што зроблена. Мы сапраўды зрабілі вельмі шмат. І не толькі ў сацыяльным плане, для нашых людзей, гэта праўда, але і вельмі шмат зрабілі ў эканоміцы», — цытуе кіраўніка дзяржавы БелТА. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў Беларусі і Расіі створана адзіная абаронная прастора, супрацьпаветраная абарона, групоўка войскаў, а таксама адзіная прастора для работы спецслужбаў.**

СТАР. 2

# МАМІНЫ ЧЭМПІЁНКІ



**Блізняты Аліна і Аліса КВЯТКОЎСКІЯ разам з мамай Галінай штодзень вяртаюцца з трэніроўкі праз навагодні кірмаш, што знаходзіцца каля Палаца спорту. Дзяўчаткі займаюцца фігурным катаннем. Хутка будуць спаборніцтвы — трэба добра падрыхтавацца. На пытанне, хто іх любімая сучасная фігурыстка, разам адказваюць: «Канешне, Аліна Загітава!» Пытаюся пра лісты да Дзеда Мароза — і зноў разам кажуць, што папрасілі кніжкі. Галіна прыемна здзіўлена, што дзяўчаткі папрасілі не апошнюю мадэль айфона, а кніжкі. Навагодні Мінск чароўны нават і без снегу!**

**Таццяна ТКАЧОВА, фота аўтара.**

## КОРАТКА

- **Вучоным года НАН Беларусі ў 2019 годзе стаў гісторык Аляксандр Каваленя.**
- У Мінскай вобласці да канца года плануюць дабудаваць амаль 470 сацыяльных кватэр.
- **Акцыя «Дзеці і бяспека» стартуе на Беларускай чыгунцы 24 снежня.**
- Кітайскія будаўнічыя кампаніі гатовы купляць беларускія піламатэрыялы на біржы.
- **«Белнафтахім»: цана сыравіны для беларускіх НПЗ за год узрасла на 34 %.**
- У Магілёве ў дзіцячым харчаванні расійскага вытворцы выявілі перавышэнне нітратаў.
- **У Палацы Рэспублікі выступіць хор імя М. Е. Пятніцкага.**

Кузня пераможцаў

# СПАРТЫЎНАЯ «МЕККА» БРЭСТА,

## або Як на вяслярным канале каля Мухаўца збіраюцца дзеці, чэмпіёны і проста аматары спорту

Веславанне ў Брэсце пачало актыўна развівацца з 1950-х гадоў і за гэты час прынесла беларускаму спорту россып медалёў і дзясяткі вядомых імёнаў для ўсяго свету. Каля яго вытокаў у тыя далёкія гады стаяў заслужаны трэнер БССР Уладзімір Пілiпенка, яго выхаванцы хутка аказаліся сярод лідараў рэспубліканскіх спаборніцтваў, а неўзабаве заваявалі і еўрапейскія п'едэсталы. Пазней славу брэсцкіх весляроў падхапіў Сяргей Макаранка, які ў пары з Леанідам Гейштарам стаў першым беларусам, хто здабыў «золата» Алімпійскіх гульняў. У 2000-х свет даведаўся пра новыя імёны алімпійскіх прызёраў, сярод якіх браставчанкі Юлія Бічык і Наталля Гелах. Сёння гэты рэгіён краіны працягвае пастаўляць у нацыянальную каманду па веславанні каштоўныя кадры: менавіта тут выраслі Хрысціна Старасельц і Алег Юрэня, тут выхавалі Настассю Яніну і Сяргея Валадзько. Журналісты «Звязды» адправіліся на славуты вяслярны канал, што размясціўся непадалёк ад Мухаўца, каб паглядзець, як зараз там расцьуць новыя чэмпіёны.

СТАР. 12

ISSN 1990 - 763X

**Кожны дзень – са «Звяздой»!**

**Усім, хто падпісаўся на І квартал або І паўгоддзе 2020 года, — у падарунак 4 календары — маляўнічы насценны, рэлігійны, народны і месяцовы**

# ПАЕЗДКА — РАБОЧАЯ, ВЫНІКІ — ПЛЁННЫЯ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Ніякіх праблем у Расіі няма для палётаў над Беларуссю. Мы заўсёды забяспечваем выключна прыстойна. У нас ніколі не было з вамі пытанняў з нагоды перавозак авіятранспартам. Нашы аэрапорты працуюць вельмі эфектыўна, — дадаў Прэзідэнт. — Мы заўсёды канстатавалі, што ў нас няма ніякіх пытанняў да нашых дыпламатычных ведамстваў. У нас адзіная мяжа, мытня на захадзе. 110 мільёнаў тон грузаў перамяшчаецца сёння з усходу на захад і з захаду на ўсход праз Беларусь».

Ён таксама звярнуў увагу, што кампанія «Беларуснафта» вярнулася да работы ў Расіі. Прычым не толькі аказвае сэрвісныя паслугі, аднаўляе старыя радовішчы, але і здабывае нафту сумесна з іншымі кампаніямі.

«Каласальны прагрэс. І ў эканоміцы, калі казаць пра людзей, сёння Беларусь купляе ў вас не толькі сыравіну, але і камплектуючыя. На прадпрыемствах у Расіі, з якімі маюць кантакты нашы прадпрыемствы, калі выпрабляюць фінішную прадукцыю, працуе больш за 10 мільёнаў расіян. Мы звычайна памнажаем, калі сям'я, на чатыры. Уявіце, колькі людзей завязана на наш з вамі тавараабарот і сумесную вытворчую кааперацыю», — акцэнтаваў увагу беларускі лідар.

«Таму ў прынцыпе з развалам Савецкага Саюза мы ні ў эканоміцы, ні ў палітыцы, ні ў сацыяльнай сферы далёка адзін ад аднаго не сышлі. Гэта таксама вялікае дасягненне гэтага дагавора (аб стварэнні Саюзнай дзяржавы. — **«Зв.»**). Калі мы і не рэалізавалі тыя пункты, якія там прапісаны, то мы не разбегліся, як гэта ёсць, дапусцім, у Расіі з іншымі рэспублікамі постсавецкай прасторы (не толькі з Прыбалтыкай або Украінай). Гэта таксама дасягненне, што намі зроблена за апошнія гады. Але вы правільна сказалі: ёсць над чым працаваць», — рэзюмаваў кіраўнік дзяржавы.

Уладзімір Пуцін у сваім уступным слове пагадзіўся, што, нягледзячы на праблемныя пытанні, дасягненні Саюзнай дзяржавы відавочныя. Ён таксама асабліва падкрэсліў, што вопыт, атрыманы Беларуссю і Расіяй у рамках двухбаковага саюзнага будаўніцтва, пасля шырока выкарыстоўваўся пры фарміраванні інтэграцыйных аб'яднанняў, у тым ліку ЕАЭС.

### Па энерганосьбітах — толькі лічбы

Міністр эканамічнага развіцця Расійскай Федэрацыі Максім Арэшкін пракаментаваў журналістам вынікі перагавораў двух прэзідэнтаў: «У нас цяпер, па выніках сённяшніх перагавораў, засталося тры групы пытанняў, якія блакуюць фінальныя дамоўленасці. Гэта дамоўленасці ў нафтавай сферы, дамоўленасці ў газавай сферы і дамоўленасці ў падатковай сферы. Гэта тры групы пытанняў, якія засталося вырашыць, каб фіналізаваць усе дарожныя карты».

Пазней Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, каментуючы сустрэчу з Прэзідэнтам Расіі і абмеркаванне беларуска-расійскага парадку дня, заявіў журналістам, што краіны канцэптуальна дамовіліся па энерганосьбітах, а цэны вызначаць у найбліжэйшыя дні. «Натуральна, засталіся самыя складаныя пытанні. Але толькі ў лічбах — энерганосьбіты. Але канцэптуальна дамовіліся, што ў будучым годзе Беларусь купляе ў Расійскай Федэрацыі прыкладна 20 мільярдаў кубічных метраў газу. Абмяркавання тут няма. Можна і 22 мільярды. З уводам атамнай станцыі, вядома, мы на 4-5 мільярдаў кубічных метраў менш будзем закупляць. Таму па аб'ёмах мы дамовіліся, і па нафце дамовіліся, што купім у Расіі 24-25 мільёнаў тон нафты. Цэны будуць не вышэй за ўзровень 2019 года», — заявіў беларускі лідар.

Паводле яго слоў, канкрэтныя цэны па нафце будуць вызначаны цягам двух дзён, па газе — двух-трох дзён. «У аўторак у «Газпраме» спецыялісты сустрэнуцца, і ўжо будуць канкрэтныя лічбы. Але ў цэлым цана застанецца на ўзроўні бягучага года», — удакладніў Прэзідэнт.

Адказваючы на пытанне, ці спатрэбіцца яшчэ дадатковая сустракацца з Уладзімірам Пуціным да канца бягучага або ў пачатку наступнага года, Аляксандр Лукашэнка сказаў: «Калі спатрэбіцца, так. Мы з ім перагаворым па тэлефоне ў найбліжэйшы час. Ёсць у нас там пара праблем, якія мы павінны вырашыць, — прэзідэнцкія пытанні. І ў выніку размовы, калі нам спатрэбіцца сустрэча, вядома, мы ў любы час, у любым месцы, у Расіі ці ў Беларусі, сустрэнемся».

Кіраўнік дзяржавы таксама адзначыў, што ў цэлым бакі задаволеныя ходам перагавораў. «Усе задаволеныя. І Прэзідэнт Расіі, і Прэзідэнт Беларусі. І міжурадавая група. У цэлым мы задаволеныя ходам і вынікамі», — рэзюмаваў ён.

### Пад старшынствам Беларусі

Падчас пасяджэння Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета лідары краін афіцыйна прынялі рашэнне аб старшынстве Беларусі ў органах Еўразійскага эканамічнага саюза ў 2020 годзе. З 1 студзеня Беларусь будзе старшынстваваць у Вышэйшым Еўразійскім эканамічным савеце, Еўразійскім міжурадавым савеце і Савеце Еўразійскай эканамічнай камісіі.

Размеркавалі пасады і ў новым складзе Калегіі ЕЭК. «Аб персанальным складзе калегіі мы толькі што дамовіліся: блок гандлю пакідае за сабой Расійская Федэрацыя. У нас застанецца тэхнічнае рэгуляванне. Агракамісію, прамысловую мы перадаём Арменіі. І за намі старшынства. Таму ўсе гэтыя пытанні вырашаны», — паведаміў Аляксандр Лукашэнка.

Старшынёй Калегіі Еўразійскай эканамічнай камісіі зацверджаны Міхаіл Мясніковіч. Прэм'ер-міністр Арменіі Нікол Пашынян прапанаваў падпісаць рашэнне без абмеркавання, бо пытанне ўжо ўзгоднена. Але Прэзідэнт Беларусі настаяў на тым, каб яно не прымалася фармальна.

Міхаіл Мясніковіч сваёй галоўнай задачай назваў забеспячэнне рэалізацыі ўсіх дакументаў і палітычнай волі лідараў ЕАЭС. «Я выдатна разумею, што будзе шмат патрэбнай, але руціннай работы, якая датычыцца ўзгадненняў, выпрацоўкі ўзаемапрымальных рашэнняў. Думаю, багаж ведаў і вопыт, якія я маю, будуць спрыяць таму, каб гэта рэалізаваць», — сказаў ён. Да сваёй работы на новай пасадзе Міхаіл Мясніковіч прыступіць з 1 лютага 2020 года.

На саміце абмеркавалі прынцыповыя пытанні аб стратэгічных кірунках развіцця еўразійскай эканамічнай інтэграцыі да 2025 года, падпісалі пагадненне аб пенсійным забеспячэнні працоўных у ЕАЭС, разгледзелі пытанне аб рабоце па ўстараненні дзяржавамі бар'ераў у рамках функцыянавання ўнутранага рынку саюза.

***

Фактычна адразу пасля пасяджэння Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета пачаўся нефармальны саміт лідараў краін СНД. На ім абмяркоўвалі захаванне гістарычнай праўды аб Другой сусветнай вайне, аб ролі краін СНД і Перамозе.

**Паводле БелТА.**

# АД ВЫБАРАЎ ДА ВЫБАРАЎ

### Падрыхтоўка да правядзення прэзідэнцкай кампаніі пачнецца пасля калядных канікул

**Аб гэтым «Звяздзе» паведаміла старшыня Цэнтральнай камісіі Беларусі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Лідзія ЯРМОШЫНА пасля пасяджэння камісіі. Распрацоўка метадычных растлумачэнняў пачнецца яшчэ да вызначэння дакладнай даты выбараў, якія мусяць адбыцца не пазней за 30 жніўня наступнага года.**

Разам з тым, зараз яшчэ падводзяцца вынікі выбарчай кампаніі — 2019. У прыватнасці, ЦВК на пасяджэнні зацвердзіла зводную справаздачу аб фактычных выдатках на падрыхтоўку і правядзенне выбараў у Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі сёмага склікання. Як паведаміла **саветнік-кансультант аддзела арганізацыйнай, фінансавай работы і міжнароднага супрацоўніцтва апарату Цэнтральнай камісіі Валянціна ВАСІЛЕЎСКАЯ**, у рэспубліканскі бюджэт вярнулася 20 039 рублёў з запланаваных 72 тысяч.

Такім чынам, у цэлым па Беларусі выдаткі на падрыхтоўку і правядзенне выбараў у Савет Рэспублікі склалі 51 916,12 рубля. Брэсцкая і Віцебская вобласці выкарысталі 78 працэнтаў ад запланаваных сродкаў, Мінская — 83,5 працэнта, Гомельская — 59 працэнтаў.

Фінансавая справаздача аб правядзенні выбараў у Палату прадстаўнікоў рыхтуецца на працягу трох месяцаў, але ўжо відаць, што і тут атрымалася значная эканомія.

На пасяджэнні таксама разгледжаны скаргі грамадзян Тушынскага і Старавойтава на вынікі выбараў па Пушкінскай выбарчай акрузе № 103 і Сенненскай № 30. Дарэчы, камісія абмяркавала заявы, нягледзячы на прапушчаныя тэрміны для іх падачы. «Каб у скаржнікаў не склалася ўяўлення аб фармальным падыходзе», — адзначыла Лідзія Ярмошына. Падстаў для задавальнення скаргаў не выяўлена.

**Варвара МАРОЗАВА.**

## Парламенцкі дзённік

# КАБ ЯДНАЛА БУДУЧЫНЯ

### У саюзным будаўніцтве мусіць дамінаваць моладзь

**Такое меркаванне выказаў падчас відэамоста Мінск—Масква «Моладзь Беларусі і Расіі — разам за Саюзную дзяржаву!», прысвечаным дзейнасці Маладзёжнай палаты пры Парламенцкім сходзе Саюза Расіі і Беларусі, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Генадзь ДАВЫДЗЬКА.**

«Вельмі добра, што нас яднае мінулае, але нашмат лепш было б, каб нас яднала будучыня. А пакуль што будучыя мэты дужа туманныя, ніяк, па вялікім рахунку, не акрэсленыя. Маладзёжная палітыка існуе, але яна носіць, на мой погляд, эфемерны характар і пазбаўлена прагматызму і зразумелых рэчаў для маладых людзей», — пракаментаваў Генадзь Давыдзька.

Напрыклад, на яго думку, мусіць існаваць нейкае «пасведчанне» маладога грамадзяніна Саюзнай дзяржавы, уласнік якога меў бы шэраг прэферэнцый: у вучобе, ахове здароўя, жыллі, падарожжах і гэтак далей.

«Ён павінны разумець, што гэта выгадна! Зараз малады чалавек разумее, што так, нашы продкі ваявалі разам, і таму мы чамусьці мусім быць разам. Хоць чым адрозніваецца ад яго, скажам, канадскія юнак ці дзяўчына? Ды нічым. Таму неабходныя надзвычайныя меры па падтрымцы маладзёжнага руху», — упэўнены дэпутат.

Падтрымала такое меркаванне і **член камісіі Парламецкага сходу па сацыяльнай і маладзёжнай палітыцы, навуцы, культуры і гуманітарных пытаннях, член Камітэта па культуры Дзяржаўнай думы Расіі Вольга ГЕРМАНАВА,** адзначыўшы: Саюзнай дзяржаве дваццаць гадоў, але не кожны грамадзянін гэта адчувае і разумее. Больш за тое, ёсць і праціўнікі такой палітычнай інтэграцыі, якія распаўсюджваюць міфы пра страчаны суверэнітэт.

«Гэта няпраўда, бо інтэграцыя ніколі не прывядзе да страты суверэнітэту ні Беларусі, ні Расіі. Гэта дзве вельмі моцныя дзяржавы, вельмі дружныя паміж сабой», — падкрэсліла Вольга Германава.

З тым, што праблем застанецца шмат, расійскі дэпутат згадзілася. Яны існуюць і ў эканамічным, і ў дэмаграфічным плане. Але ёсць і дасягненні, нагадала яна: сумесныя сем'і атрымліваюць «мацярынскі капітал» і карыстаюцца мерамі падтрымкі, што ёсць у Расіі. Працаўладкаванне грамадзян Саюзнай дзяржавы адбываецца на аднолькавых умовах, беларусы могуць атрымаць дыпломы аб вышэйшай адукацыі расійскага ўзору і наадварот.

**Варвара МАРОЗАВА.**

## На дарозе

# ПРАЦАВАЦЬ НА ПАПЯРЭДЖАННЕ

**Міністр унутраных спраў Юрый Караеў рэкамендаваў супрацоўнікам ДАІ максімальна якасна арганізаваць папераджальную работу. Пра гэта паведаміла афіцыйны прадстаўнік МУС Вольга ЧАМАДАНАВА.**

— Да кожнага канкрэтнага выпадку будзе максімальна дыферэнцыраваны падыход. У яго аснову ляжа разуменне з боку грамадзян неабходнасці выканання правілаў дарожнай бяспекі і добразычлівасць да саміх парушальнікаў. Але і меры адміністрацыйнага рэагавання, натуральна, нікуды не знікнуць. Калі чалавек свядома парушае правілы дарожнага руху і не ўспрымае заўвагу, то, канешне, словы на яго наўрад ці падзейнічаюць. Разам з тым не акрэсліваецца кола парушэнняў правіл, па якіх будзе складацца пратакол.

Немагчыма пакінуць без увагі парушэнні, звязаныя з бяспекай грамадзян, — напрыклад, кіраванне транспартам у стане алкагольнага ап'янення, праезд на чырвонае святло, няпропуск пешахода... Але разам з тым сачэнне за дарожнай бяспекай будзе працягвацца згодна з дзеючым заканадаўствам. Зрэшты, некаторыя нормы КаАП могуць быць перапрацаваны.

Начальнік УДАІ Міністэрства ўнутраных спраў Дзмітрый Карзюк зазначыў, што ў бліжэйшы час супрацоўнікі ДАІ разам з уладальнікамі дарог (гэта значыць Міністэрствам транспарту, аблвыканкамамі і Мінгарвыканкамам) праравізуюць дарожныя знакі. Будуць таксама ўнесены некаторыя карэкціроўкі ў работу радараў. Але адбудзецца гэта толькі пасля дэталёвага аналізу ДТЗ, дзе фігуруе перавышэнне хуткасці.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

## Нашы дзеці

# ЧАС ЦУДАЎ

**У Беларусі працягваецца навагодняя дабрачынная акцыя «Нашы дзеці». Міністр унутраных спраў Юрый КАРАЕЎ і начальнік Дэпартамента выканання пакаранняў Алег МАТКІН адправіліся ў Радашковіцкую школу-інтэрнат для дзяцей-сірот і малых, якія засталіся без апекі бацькоў.**

— Прыход да дзяцей перад Новым годам вельмі замілоўвае і пакідае добрыя ўражанні, — адзначыў Юрый Караеў. — Уяўляю сабе, што для малых Новы год — гэта казкі, сцэнкі і, вядома ж, падарункі. Пакінуць у такія перадсвяточныя дні іх без увагі — гэта грэх. А наша задача — стварыць ім адпаведны настрой.

Высокія госці прыехалі да дзяцей з падарункамі. Яны падарылі школе-інтэрнату мэблю і спартыўны інвентар. Кожны малы атрымаў салодкі сюрпрыз, выхаванцы паказалі цікавае прадстаўленне.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

Будзе свята!

# У чаканні чараўніцтва,

## або Раство і Новы год — на любы густ

**Для стварэння навагодняй атмасферы ў сталіцы ўстаноўлена 30 вялікіх штучных ёлак. Лясгасы ж плануюць паставіць каля 30 тысяч жывых ёлак. Купіць навагоднія дрэўцы на кірмашах можна будзе з 22 да 31 снежня. Аб гэтым расказаў намеснік начальніка аддзела арганізацыі гандлю і грамадскага харчавання галоўнага ўпраўлення спажывецкага рынку Мінгарвыканкама Дзмітрый ПЛЯХАНАЎ.**

— Для пакупнікоў прапануецца больш за за тры тысячы найменняў ёлачных упрыгожванняў, амаль 450 тысяч салодкіх навагодніх падарункаў. Святочныя кірмашы пройдуць практычна ва ўсіх раёнах сталіцы. На вуліцы Кальварыйскай, 21 з 21 снежня да 15 студзеня ўсіх ахвотных чакае модны кірмаш з фуд-кортамі кухняў народаў свету. Удзел у ім прымуць больш за 40 прадстаўнікоў грамадскага харчавання. Пляцоўка знаходзіцца пад адкрытым небам, уваход бясплатны. У рамках кірмашу — фестываль зімовых напояў, фотазона з каруселлю. Для наведвальнікаў будуць прадстаўлены арт-аб'екты і дызайнерская ёлка, а таксама выстаўка прадукцыі беларускіх рамеснікаў.

Маладзёжная лакацыя з фуд-тракамі «Пясочніца» па вуліцы Куйбышава, 45 будзе працаваць з 25 да 29 снежня, наведаць яе можна з 12 да 21 гадзіны. Плануецца дзевяць пунктаў з ежай, у праграме — выстаўка самавараў і ледзяных фігур, па вечарах — фаер-шоу.

— «Калядны кірмаш» з 12 шклянымі гандлёвымі павільёнамі на Кастрычніцкай плошчы ўжо прапануе паспрабаваць смажаных слімакоў, дранікі і бліны з рознымі начынкамі, бургеры і хот-догі, венгерскія калачы, шашлыкі і стравы, прыгатаваныя на мангале. З навінак — мяса ў тандыры. Традыцыйна ў продажы глінтвейн ды іншыя напоі, — дадаў Дзмітрый Пляханаў. — Гандаль будзе весціся да 7 студзеня з 12 да 23 гадзін, а з 8 да 15 студзеня — з 12 да 20 гадзін. У навагоднюю ноч яго можна наведаць з 23 гадзін да 4 гадзін раніцы.

На пляцоўцы каля Камароўскага рынку 21 снежня адкрыецца навагодні кірмаш «Мяцеліца», дзе будуць размешчаны 24 драўляныя хаткі. Ён будзе працаваць з 12 да 22 гадзін, у навагоднюю ноч — да шасці гадзін. На святочных гандлёвых радах гасцей парадуе гарачая ежа, прысмакі, экапрадукты, напоі, вырабы рамеснікаў.

— У раёне Палаца спорту «Калядны кірмаш» працуе да 15 студзеня з 14 да 23 гадзін у будныя дні і з 12 да 23 гадзін — у выхадныя. У навагоднюю ноч — з 23 гадзін вечара да чатырох гадзін раніцы, — адзначае Дзмітрый Пляханаў. — Пад Новы год на «Калядным кірмашы» з'явіцца больш за 35 драўляных гандлёвых шале з шырокім асартыментам навагодніх тавараў: ад традыцыйных упрыгожванняў і падарункаў да прадукцыі харчовай і лёгкай прамысловасці. Падрыхтавана і насычаная забаўляльная праграма.

Сёлета даўжыня ілюмінацыі ў сталіцы складае 107 кіламетраў, колькасць выкарыстаных гірляндаў пры гэтым — 685 штук, лямпачак — 117 тысяч. Аб гэтым расказаў **галоўны інжынер УП «Мінгарсвятло» Аляксандр ВАРАБЦОЎ.**

— Дадатковае светлавое афармленне можна ўбачыць па вуліцах Сталетава, Карвата, Чкалава, на Партызанскім праспекце ад вуліцы Куляшова да Кабушкіна. На праспекце Незалежнасці рэкламных расцяжак не будзе, замест іх — аб'ёмныя светлавыя канструкцыі ад вуліцы Свярдлова да вуліцы Янкі Купалы. На фасадзе Дома прафсаюзаў у тэставым рэжыме ўжо працуе навінка бягучага года — светлавая праекцыя.

Рэспубліканская дабрачынная акцыя «Нашы дзеці» будзе доўжыцца да 10 студзеня. У межах мерапрыемства — навагодніе свята для хлопчыкаў і дзяўчынак у Палацы Рэспублікі, якое адбудзецца 27 снежня. Аб гэтым паведаміў **намеснік начальніка ўпраўлення культуры Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта Аляксандр ШАСТАКОЎ.**

— А таксама 28 снежня ў Палацы Незалежнасці пройдзе рэспубліканскі «Венскі баль» для моладзі. Іншыя навагоднія святы адбудуцца там жа з 29 снежня да 7 студзеня. У Мінскім гарадскім палацы дзяцей і моладзі 21 снежня ў 15 гадзін пачнецца навагодняе мерапрыемства «Баль у Палацы» для старшакласнікаў і студэнтаў сталіцы, якія дабіліся поспехаў у вучобе, спорце і іншых сферах. У Белдзяржцырку 26 снежня ў 14.30 для дзяцей пачнецца дабрачыннае прадстаўленне. А з 28 снежня да 5 студзеня на Ратушнай плошчы пройдзе навагодні спектакль «Чароўная скрыначка Дзеда Мароза», 28 снежня — у 20 гадзін, з 29 да 5 студзеня — штодня ў 17.30 і ў 20.30. На Кастрычніцкай плошчы з 28 снежня да 5 студзеня штодня ў 18 і 21 гадзіну будзе пачынацца «Навагодні зорапад». Спартыўна-калядны турнір для аматараў хакея пройдзе на «Чыжоўка арэне» з 3 да 7 студзеня.


Фота Тацяны ТКАЧОВАЙ.

Дар'я ШЛАПАКОВА.

# НЯЗГАСНЫ СІМВАЛ

## Цудатворны агонь з Віфлеема прывезлі ў Гродна

**Першым калядны сімвал ад скаўтаў прынялі ў Фарным касцёле, дзе адбылася вячэрняя імша. Адсюль агонь пачне свой шлях па ўсіх храмах краіны, як каталіцкіх, так і праваслаўных. Кожны вернік зможа запаліць свячу ад Віфлеемскага агню і прынесці ў свой дом.**


Фота grodnonews.by.

Такая традыцыя існуе больш за 30 гадоў. Агонь, які запальваецца ў базіліцы Нараджэння Хрыстовага ў Віфлееме, упершыню пачаў сваю вандроўку ў 1986 годзе. Тады супрацоўнікі англійскай тэлерадыёкампаніі прывезлі з Віфлеема лампадку, каб падтрымаць хворых і адзінокіх людзей падчас свята.

Праз 10 гадоў гэта місія пашырылася і ахапіла 22 краіны, у тым ліку і Беларусь. Першымі агонь сустракаюць у Гродне, куды яго дастаўляюць польскія скаўты. Для вернікаў-хрысціян віфлеемскі агонь мае асаблівае значэнне і сімвалізуе вобраз нязгаснай веры, спакой і надзею. У Фарным касцёле агонь будзе гарэць да 6 студзеня, затым яго перададуць у праваслаўны храм. Многія гродзенцы ўжо скарысталіся магчымасцю запаліць свае лампадкі.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

# Ад Пінска — Лідзе

## Эстафета культурнай сталіцы накіроўваецца з Брэстчыны на Гродзеншчыну

**У Пінску прайшла ўрачыстая цырымонія закрыцця рэспубліканскай акцыі «Пінск — культурная сталіца — 2019».**

Мерапрыемства пачалося з адкрыцця «Алеі падзей» на пешаходнай вуліцы Леніна побач са знакамітым бронзавым пінчуком. Тут заклалі першую пліту алеі — «Пінск — культурная сталіца — 2019». Гэтая пліта стане напамінам пра год, які быў насычаны культурнымі мерапрыемствамі і падзеямі. З часам з'явяцца новыя знакі самых важных і адметных падзей гарадскога жыцця.

— Наш горад мае даволі насычаную культурную праграму кожны год, — сказаў карэспандэнту «Звязды» **старшыня Пінскага гарвыканкама Іван РЭБКАВЕЦ.** — Але статус культурнай сталіцы абавязаў згуртаваць усе таленты і намаганні і паказаць, на што мы здатныя. Усяго за год прайшло больш за 400 мерапрыемстваў, звязаных з гэтай падзеяй. З іх прыкладна чатыры дзясяткі вылучаюцца значным маштабам і вялікай колькасцю ўдзельнікаў. Гэта, напрыклад, фестываль духавых аркестраў, фэст арганнай музыкі, вялікі фестываль мастацтваў «Зоры над Пінай». Нашы арганізатары культурнай праграмы надалі асаблівае значэнне масавым мерапрыемствам, стараліся прыцягнуць як мага больш жыхароў горада, таленавітай моладзі, дзяцей.

На цырымоніі закрыцця рэспубліканскай акцыі пінчукі дзяліліся багатым вопытам і напрацоўкамі. У гарадскім Доме культуры прайшла прэзентацыя праектаў культурных устаноў. Ну і адзначылі закрыццё акцыі вялікім канцэртам майстроў мастацтваў і самадзейных артыстаў. А пад заслону Пінск перадаў эстафету культурнай сталіцы будучага года — Лідзе.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Старшыня КНР сустрэнецца з лідарамі Паўднёвай Карэі і Японіі



Сі Цзіньпін на наступным тыдні правядзе сустрэчу з прэзідэнтам Паўднёвай Карэі Мун Чжэ Інам, а таксама прэм'ер-міністрам Японіі Сіндза Абэ, якія прыбудуць у Кітай для ўдзелу ў 8-й трохбаковай сустрэчы. Пра гэта на спецыяльным брыфінгу паведаміў намеснік міністра замежных спраў КНР Ло Чжаахуэй. Трохбаковы саміт Кітая, Рэспублікі Карэя і Японіі адбудзецца ў горадзе Чэнду (правінцыя Сычуань, Паўднёва-Заходні Кітай) 23—24 снежня. З кітайскага боку ў ім возьме ўдзел прэм'ер Дзяржсавета КНР Лі Кэцян. Як заўважыў намеснік міністра замежных спраў Кітая, «кіраўніцтва трох краін надае вялікую важнасць маючай адбыцца сустрэчы, яна таксама ўяўляе вялікую цікавасць для міжнароднай супольнасці». Па словах Ло Чжаахуэя, удзельнікі саміту абмяркуюць, як паглыбіць практычнае супрацоўніцтва з улікам інтарэсаў бакоў, абмяняюцца поглядамі па такіх пытаннях, «як навука і тэхналогіі, інавацыі, устойлівае развіццё, старэнне насельніцтва, чалавечыя абмены, новыя кірункі і ідэі для супрацоўніцтва». «Па выніках, як чакаецца, будзе апублікавана агульнае бачанне развіцця супрацоўніцтва ў найбліжэйшае дзесяцігоддзе», — рэзюмаваў намеснік міністра замежных спраў КНР.

### У Бейруце пасля прызначэння новага прэм'ера аднавіліся пратэсты



Прызначэнне прэм'ер-міністрам Лівана 60-гадовага тэхнакрата Хасана Дзіаба выклікала новую хвалю дэманстрацый у Бейруце. Актывісты пратэстнага руху правялі мітынг перад домам суніцкага палітыка ў фешэнебельным квартале Тэлет-Хаят у мусульманскай частцы горада. Яны затрабавалі роспуску парламента і правядзення датэрміновых выбараў, перадае ТАСС. Пратэстоўцы перагароджвалі вуліцы ў кварталах Вэрдэн, Кола, Тарык-эль-Джэдыда, Каскас, а таксама ў прыгарадзе Хальдэна. Натоўпы дэманстрантаў накіраваліся ў цэнтр сталіцы да будынка палаты дэпутатаў і ўрадавага палаца, якія ўзмоцнена ахоўваюцца вайскоўцамі і паліцыяй. Лідар «Аль-Мустакбаль», былы прэм'ер-міністр Саад Харыры, які адмовіўся ад вылучэння на пасаду кіраўніка кабінета, заклікаў сваіх прыхільнікаў устрымацца ад удзелу ў вулічных акцыях і перакрыцці аўтастрад. Тым не менш у шэрагу месцаў паміж вартавымі парадку і дэманстрантамі адбыліся сутычкі. Прэзідэнт Лівана Мішэль Аун даручыў сфарміраваць новы ўрад незалежнаму палітыку Хасану Дзіабу пасля кансультацый з парламенцкімі фракцыямі ў палацы Баабда. Кандыдатуру Дзіаба, які займаў пасаду міністра адукацыі ў 2011—2014 гадах, падтрымалі 69 з 128 дэпутатаў. Новы прэм'ер паабяцаў у сваім першым выступленні распрацаваць рэалістычны план рэформаў па выратаванні Лівана. «Я падзяляю патрабаванні народнага руху, якія надаў правільны кірунак палітычнага жыцця», — сказаў Дзіаб.

### Facebook створыць «забойцу» Android




Facebook пацвердзіла планы аб стварэнні «забойцы» Android. Уласная аперацыйная сістэма патрэбна кампаніі для зніжэння залежнасці ад аперацыйнай сістэмы Google, піша The Information. У гэтым дапаможа Марк Лукоўскі, які займаўся запускам Windows NT. Цікавасць кампаніі пацвердзіў кіраўнік Facebook па праграмным забеспячэнні Эндру Босварт, які заўважыў, што сацсетка не можа цалкам давяраць прадуктам канкурэнтаў. У справаздачы адзначаецца, што мадыфікаваная версія Android выкарыстоўваецца ў прыладах Oculus і Portal. Прадстаўнікі VR-падраздзялення кампаніі адзначылі, што ў будучым сацсетка мае намер поўнасцю адмовіцца ад праграмнага забеспячэння Google. Плануецца стварыць закрытую аперацыйную сістэму, запазычыўшы падыход Apple. The Information адзначае, што Facebook працуе над акулярамі дапоўненай рэальнасці пад кодавай назвай Orion. Эксперты мяркуюць, што дэвайс выйдзе ў 2023 годзе і стане першым гаджэтам кампаніі Марка Цукерберга, які будзе працаваць на ўласнай аперацыйнай сістэме.

# КОШТ ПРАЕЗДУ — ПЛЮС ПЯЦЬ КАПЕЕК?

**Па інфармацыі дзяржаўнага прадпрыемства «Сталічны транспарт і сувязь», прынята рашэнне аб павышэнні тарыфаў на праезд у гарадскім і прыгарадным пасажырскім транспарце.**

У адпаведнасці з ім разавыя паездкі на наземным транспарце і ў метро падаражэюць на пяць капеек, праезд у прыгарадных аўтобусах — на дзве капейкі за адзін кіламетр. Дакументу трэба будзе яшчэ атрымаць абавязковае экспертнае заключэнне Міністэрства юстыцыі, толькі пасля гэтага новыя тарыфы пачнуць дзейнічаць.

Калі дакумент пройдзе экспертызу, то талон на адну паездку на наземным гарадскім транспарце (на звычайных і хуткасных маршрутах) абыдзецца пасажырам у 65 капеек, жэтон у метро — у 70 капеек. Кошт правозу ручной паклажы ў наземным транспарце павысіцца да 65 капеек, у метро — да 70.

Нагадаем, у сталіцы апошні раз тарыфы на праезд у гарадскім грамадскім транспарце змяняліся ў лістападзе 2017 года, калі цана разавай паездкі вырасла на пяць капеек.

Сяргей РАСОЛЬКА.

# «Аформіў дакументы — спі, працуй спакойна»

**У снежні падраздзяленні па грамадзянстве і міграцыі органаў унутраных спраў адзначылі свае 99-годдзе. Карэспандэнты «Звязды» разам з міліцыянерамі выправіліся ў рэйд па рынку «Ждановічы» для выяўлення нелегальных мігрантаў.**

* * *

На службу заступаем у пятніцу а 14-й гадзіне. На рынку не вельмі ажыўлена, і прадаўцоў больш, чым пакупнікоў.

Падыходзім да гандлёвага пункта з хуткай ежай. Жанчына за прылаўкам неславянскай знешнасці з усмешкай працягвае пашпарт: «У мяне ўсё ў парадку».

Відаць, дасведчаная. Дарэчы, прадстаўнікоў аддзела па грамадзянстве і міграцыі (АГіМ) на рынку ў твар ведаюць многія. Планавыя рэйды і раптоўныя праверкі тут праводзяцца рэгулярна. Часам дапамагаюць супрацоўнікі АМАП, участковыя інспектары.

У Тхі Фыёнг — рэгістрацыя часовага пражывання ў Ленінскім раёне сталіцы. Ёсць і спецыяльны дазвол на права ажыццяўлення працоўнай дзейнасці. Грамадзянка В'етнама — кухарка. У Беларусі яна з 2013 года.

— А я вось там стаю, праз два шэрагі, — далучаецца да размовы жанчына гадоў 45 і запрашае падысці: — Усе неабходныя «паперы» ёсць. Падыходзьце. 30 гадоў жыву ў Беларусі, яшчэ студэнткай сюды трапіла. Раней рускую мову для в'етнамцаў выкладала. Цяпер ужо бабуля, унук ёсць. Вось на пенсіі сюды і прыйшла. Дома сядзець не магу — сумна.

Такая прапанова і адкрытасць не здзіўляюць нашых калег. У апошнія гады колькасць парушэнняў сярод працоўных мігрантаў у Мінску відавочна знізілася. Сярэдні ўзрост тых, хто ўсё ж такі пераступае закон, — 20—30 гадоў. Часцей за ўсё пападаюцца мужчыны.



— На тэрыторыі Цэнтральнага раёна Мінска на ўліку стаіць 6050 замежных грамадзян. За 11 месяцаў 2019 года па месцы знаходжання зарэгістравана 3868 чалавек, — расказвае **начальнік аддзела па грамадзянстве і міграцыі Цэнтральнага РУУС Мінска падпалкоўнік міліцыі Руслан ІВАШКА *(на фота)*.** — За парушэнне правілаў знаходжання ў Беларусі прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці 453 замежнікі. 26 «гасцей» дэпартавалі, 17 — выслалі.

* * *

Невялічкую кавярню на ўскраіне рынку абслугоўваюць в'етнамцы. Бік Лоан — 48 гадоў, яе пляменніку Мінь Хоангу — 31. У сваякоў — від на жыхарства. Такім грамадзянам дадзена права працаваць нароўні з беларусамі, без спецыяльных дазволаў.

— Муж прыехаў сюды даўно, пры Савецкім Саюзе. Вучыўся ў Беларусі, — расказвае жанчына. — А потым я да яго перабралася. Сям'я павінна жыць разам.

На пытанне, як ідзе бізнес, Бік Лоан разводзіць рукамі: «У пачатку нулявых кліентаў было мора! Цяпер людзі больш любяць у рэстаранах ды вялікіх гандлёвых цэнтрах перакусваць».

Але, нягледзячы на сціплыя продажы, на радзіму в'етнамцы вяртацца не збіраюцца.

— У вас спакойна і мірна. Гэта галоўнае, — адзначае Мінь Хоангу. — І работу, калі захацець, знайсці можна. А яшчэ я ажаніцца хачу. Нявесту сярод беларусак шукаю.

Міліцыянеры кажуць, што нярэдка замежнікі заключаюць шлюб з мясцовымі дзеля легалізацыі ў краіне. Праз нейкі час сям'я распадаецца. Таму такіх былых мужа і жонку таксама правяраюць. Пры наяўнасці доказаў суд прызнае саюз несапраўдным, і дазвол на пражыванне ў Беларусі анулюецца.

* * *

Па словах супрацоўнікаў АГіМ, правапарушэнні ў асноўным выяўляюць на аптовым плодаагародніным рынку. Прыезджыя часта працуюць без неабходных дакументаў. Зімой тут цішэй, але праверыць усё роўна трэба.



— У мяне дом у Пухавіцкім раёне, — дзеліцца 50-гадовы азербайджанец. — Я вырошчваю бульбу, моркву, цыбулю. Свой ураджай і прадаю. У Беларусі пяць гадоў. Краіна падабаецца: чыста, людзі ветлівыя.

На думку мужчыны, гандляры сталі больш дысцыплінаваныя: — Каму патрэбныя праблемы? Аформіў усе дакументы — спі, працуй спакойна. А калі што незразумела — у пэўных службах дакладна ўсё растлумачаць. Я сам колькі разоў навічкоў да іх накіроўваў.

На плодаагародніным рынку часцей за ўсё з замежных гандляроў можна сустрэць узбекаў, азербайджанцаў, кыргызстанцаў, грузінаў.

Ідзём далей. Старанна ўглядаемся ў твары прадаўцоў і іх дзеянні. Цікава, што праваахоўнікі перад праверкай дакументаў заўсёды фіксуюць на відэа, як меркаваны парушальнік працуе. Дзякуючы гэтым запісам удаецца даказаць неправамернасць яго дзеянняў.

— Часта людзі адмаўляюць сваю віну. Напрыклад, кажуць, што проста ішлі міма і спыніліся каля гандлёвага пункта павітаць знаёмага або завязаць шнуркі. Іншыя сцвярджаюць, што заблукалі і пыталіся, як знайсці выхад, — тлумачыць **старшы інспектар АГіМ маёр міліцыі Аляксей ШАБАН.**

* * *

— Вашы дакументы, калі ласка, — пытаюцца ў хлопца гадоў 28 супрацоўнікі АГіМ.

— Пашпарт у дзядзькі, а ён да тэлефона не падыходзіць. Мабыць, заняты. Давайце крыху пачакаем, — апраўдваецца гандляр нявагоднімі ўпрыгажэннямі. — Свята хутка, навошта настрой адзін аднаму псаваць.

— Ён добры хлопец, гаварлівы, — нягучна кажа сусед па рабочым месцы. — Але больш нічога не ведаю. Я сам сёння першы дзень тут, дагэтуль наёмны рабочы стаяў.

Свята святам, але закон адзіны для ўсіх. Гандляра даставілі ў аддзел па грамадзянстве і міграцыі для высвятлення асобы і ўсіх абставін. Па дарозе грамадзянін Узбекістана расказаў, што прыехаў у Беларусь два месяцы таму да дзядзькі. Перад Новым годам вырашыў крыху падзарабіць і памяняў прадаўца, які сышоў у адпачынак.

У хлопца не аказалася ні рэгістрацыі (якая павінна была быць зробленая ў 5-дзённы тэрмін пасля прыезду), ні дазволу на права ажыццяўлення працоўнай дзейнасці.

Замежніка прыцягнуць да адміністрацыйнай адказнасці ў адпаведнасці з артыкулам 23.55 часткі 6 КаАП. Аказваецца, ён ужо трапляў у поле зроку міліцыянераў на працягу года. З ім была праведзеная прафілактычная работа. Відаць, урок «госць» не засвоіў. Гэтым разам яго чакае штраф у памеры ад дзесяці да ста базавых велічынь і, хутчэй за ўсё, дэпартацыя.

Сваяка, які прытуліў госця, таксама пакараюць за даванне памяшкання для пражывання замежнаму грамадзяніну, які знаходзіцца ў Беларусі з парушэннем правілаў знаходжання. Частакй 4 артыкула 23.55 КаАП за гэта прадугледжана папярэджанне або накладанне штрафу ў памеры да дваццаці базавых велічынь.

**Кацярына АСМЫКОВІЧ.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**



❍ У тэму

**Днямі Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў змяненні ў Закон «Аб прававым становішчы замежных грамадзян і асоб без грамадзянства ў Рэспубліцы Беларусь».**

**Закон прадугледжвае павелічэнне з 5 да 10 сутак тэрміну, на працягу якога госці Беларусі абавязаны зарэгістравацца па месцы фактычнага часовага знаходжання. Карэкціруюцца падставы адмовы замежным грамадзянам у выдачы візы. Дакументам вызначаецца механізм атрымання імі інфармацыі аб уключэнні ў спіс асоб, уезд якіх у краіну забаронены або непажаданы.**

**Па словах першага намесніка начальніка Дэпартамента па грамадзянстве і міграцыі МУС Віталя Навумчыка, асноўная частка палажэння ўвойдзе ў сілу 1 ліпеня 2020 года.**

У сеціве

# Падлеткавая злачыннасць з прыстаўкай «кібер»

Велізарныя магчымасці, якія дае інтэрнэт, далёка не заўжды выкарыстоўваюцца выключна ў добрасумленных мэтах. У тым ліку і падлеткамі. Пакаэчыкі дзіцячай злачыннасці, звязанай з кіберпрасторай, істотна ўзраслі ў адыходзячым годзе.

**Намеснік начальніка ўпраўлення па раскрыцці злачынстваў у сферы высокіх тэхналогій МУС Кірыл ВЯТКІН** расказаў, што калі летась у дачыненні да падлеткаў было скончана расследаванне 55 крымінальных спраў, то сёлета гэты лік падскочыў ужо да 137. Адказнасць у асноўным надыходзіць па артыкуле 212 Крымінальнага кодэкса — за крадзеж пры дапамозе камп'ютарнай тэхнікі. Адметна, што пачынаецца яна з 14 гадоў.

Але якія менавіта злачынствы ў сеціве здзяйсняюць падлеткі?

— Перш за ўсё — гэта аплата тавараў, работ, паслуг, папаўненне балансаў электронных кашалькоў, уліковых запісаў у анлайн-гульнях з выкарыстаннем знойдзеных банкаўскіх картак, — кажа Кірыл Вяткін. — Разам з тым знойдзенымі карткамі яны могуць расплачвацца і ў афлайне — напрыклад, у звычайнай краме або рэстаране хуткага харчавання. Нярэдка яны ўзломваюць і чужыя акаўнты ў інтэрнэце. Або бяруць чужы тэлефон пазваніць і за лічаныя секунды афармляюць мікрапазыку на суму да 100 рублёў, якую тут жа пераводзяць сабе або на банкаўскую картку, або на баланс тэлефона. І зусім не адзінкавыя выпадкі, калі высвятляецца, што цераз закон пераступіў малы, які яшчэ не дасягнуў узросту крымінальнай адказнасці.

Сумная пальма першынства тут на рахунку аднаго 13-гадовага падлетка. Пры дапамозе шкоднай праграмы яму ўдалося ўзламаць уліковыя запісы на розных серверах. Гэта былі інтэрнэт-крамы і букмекерскія канторы.

Але толькі фінансавымі злачынствамі школьнікі не абмяжоўваюцца. Пра гэта расказаў **начальнік аддзела арганізацыі работы інспекцый па справах непаўналетніх упраўлення прафілактыкі галоўнага ўпраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі МУС Сяргей ЯНКОЎСКІ:**

— Нярэдкія выпадкі ўмяшання ў прыватнае жыццё, калі пачынаецца так званы «кібербулінг» — пастаянныя зняважгі, абразы, цкаванне. Сустракаюцца выпадкі і сексуальных дамаганняў. Тэндэнцыя апошніх гадоў — уцягванне школьнікаў у распаўсюджванне наркотыкаў шляхам прапановы работы кур'ерам.

Як зазначыў **начальнік аддзела па наглядзе за выкананнем заканадаўства аб непаўналетніх і моладзі Генпракуратуры Аляксей ПАДВОЙСКІ,** калі ў 2017 годзе ў Беларусі ад злачынстваў у сусветнай павуціне пацярпела 37 непаўналетніх, то летась іх было 98, а за першую палову 2019-га — ужо 81. Прычым дванаццаці з іх яшчэ не споўнілася чатырнаццаць гадоў.

Але як жа не папоўніць шэрагі ахвяр? Сяргей Янкоўскі раіць тактыку ўважлівага назірання, гэта значыць, уступіць у суполку, якую наведвае ваша дзіця, але без патрэбы не ўмешвацца:

— Як варыянт — падпісацца на акаўнт малога. Толькі, канешне, не раскрываючы сваё сапраўднае імя. І паглядзець знутры, што адбываецца на яго старонцы, з кім ён кантачыць. Але калі вы даведаліся пра нейкія нядобрыя рэчы з боку дзіцяці, то не трэба бегчы адразу з рэменем. Неабходна гутарыць акуратна, паспрабаваць зрабіць так, каб дзіця само ўсвядоміла памылковасць сваіх дзеянняў. Калі ж дзейнічаць напралом, то праблема нікуды не дзенецца, а толькі схаваецца. Да пэўнага часу...

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

На ўзроўні

# СПОРТ І СЛУЖБА — ЦАЛКАМ СУМЯШЧАЛЬНЫЯ

**Фізічная і агнявая падрыхтоўка — тое, што павінна быць на «выдатна» ў кожнага супрацоўніка міліцыі. Ад хуткасці яго рэакцыі часам залежаць чалавечыя жыцці. Натуральна, што найлепшыя з лепшых выходзяць на вышэйшы ўзровень спаборніцтваў — міжнародны. І тут ужо ахоўнікі правапарадку пачынаюць абменьвацца назапашаным досведам.**

Як жа справы ў нашых міліцыянераў у гэтай сферы? Пра гэта «Звяздзе» расказаў **начальнік аддзела службовай падрыхтоўкі ўпраўлення прафесійнай падрыхтоўкі Галоўнага ўпраўлення кадраў МУС палкоўнік міліцыі Віктар ЯНЧУКОВІЧ.**




## СУСВЕТНЫЯ ГУЛЬНІ

***— Увосень нашы міліцыянеры ўдзельнічалі ў III Сусветных паліцэйскіх гульнях у Мілане. Там яны занялі трэцяе месца ў агульнакамандным заліку...***

— Спярша трэба расказаць колькі слоў пра сам турнір. Праводзіцца ён раз на два гады і збірае прадстаўнікоў каля пяцідзесяці краін. І кожны раз туды ўключаюцца новыя віды спорту. Канкрэтны іх пералік вызначаецца на адмысловым кангрэсе за год да старту. Між іншым, IV гульні пройдуць у Кувейце ў лютым 2021 года. Таму зусім хутка будзе вызначаны іх рэгламент.

Але вернемся да Мілана. Там былі прадстаўлены сем відаў спорту — дзюдо, джыу-джыцу, практычная стральба, плаванне, крос, велагонкі і стэндавая стральба. Як бачым, амаль усё — традыцыйныя алімпійскія дысцыпліны. Зборная Беларусі заявілася на пяць дысцыплін: нашы міліцыянеры не ўдзельнічалі ў велагонцы і стэндавай стральбе. Трэнерскі штаб перад гульнямі правёў адмысловую нараду і вырашыў пакуль узяць тут тайм-аут. Мы супраць таго, каб нашы спартсмены ў пагонах выступалі ў ролі статыстаў.

Лёгкаатлетычны крос, які адкрываў спаборніцтвы, прымусіў пахваляваца. У жаночым заліку на бегавую дарожку выйшлі тры беларускі. Сяржант міліцыі Ніна Савіна, якая служыць міліцыянерам роты патрульна-паставой службы міліцыі УУС Бабруйскага гарвыканкама, паказала «бронзавы» вынік.

***— Здаецца, яе прозвішча было сярод пераможцаў Мінскага паўмарафона?***

— Менавіта так! І таму Ніна ехала ў Мілан з вялікімі медальнымі шанцамі, якія і апраўдаліся. А вось дзве іншыя нашы спартсменкі занялі ў выніку чацвёртае і пятае месца. Роўных жа не было прадстаўніцам Бахрэйна — невялікай астраўной краіны ў Персідскім заліве. Канешне, крыху крыўдна, што да п'едэстала нашым не хапіла зусім крыху, але перамагае наймацнейшы. Мужчыны таксама занялі даволі высокія месцы — з пятага да сёмага. Гэта значыць, што нам ёсць над чым працаваць.

Што да плавання, то мы пачалі актыўна развіваць гэты від спорту каля чатырох год таму. Паўдзельнічалі ў некалькіх міжнародных турнірах, і па іх выніках трэнерскі штаб вырашыў, што ў Мілане зможам паказаць годныя вынікі. Прагноз спраўдзіўся цалкам. Гэты від спорту прынёс цэлы россып медалёў (аж дванаццаць штук!), сярод якіх два залатыя.

***— Ці былі нейкія нечаканасці?***

— На жаль, без іх не абышлося падчас спаборніцтваў па практычнай стральбе. Літаральна за два тыдні да старту нашы стралкі выйгралі турнір у венгерскім Мішкальцы і ехалі ў Мілан у прыўзнятым настроі. А вось на італьянскай зямлі нас і чакаў «сюрпрыз». Арганізатары раптоўна забаранілі выкарыстоўваць падчас стрэльбаў уласную зброю і далі сваю. А соль у тым, што прапанаваныя Beretta на нашым узбраенні не знаходзяцца. Нашы стралкі карыстаюцца пісталетамі марак Glock і SIG Sauer. Тым не менш у камандным заліку нашы дзяўчаты здабылі «серабро», а ў асабістым заліку старшы лейтэнант міліцыі УУС Мінаблвыканкама Інга Станкоўская заваявала «бронзу».

Вельмі парадавалі нашы барцы. І гэта нездарма — у Міністэрстве ўнутраных спраў створана вельмі магутная школа. Сярод прызоў — тры залатыя медалі! А менавіта: у маёра Святланы Цімашэнкі з унутраных войскаў МУС — дзюдо (катэгорыя звыш 78 кг), прапаршчыка міліцыі Анжэлы Жылінскай з Цэнтральнага (горада Мінска) аддзела Дэпартамента аховы і радавога міліцыі Марыі Кандрацьевай з Маскоўскага (горада Мінска) аддзела Дэпартамента аховы — джыу-джыцу (катэгорыі да 70 і звыш 70 кг адпаведна). Прычым джыу-джыцу для нас — новы від спорту. Ён скіраваны на тое, каб «скаваць» праціўніка і ўтрымліваць яго. А між іншым, на гэта і робіцца ўпор пры затрыманні злачынцы. Вось усё гэта і дазволіла нам заняць выніковае трэцяе месца, нават нягледзячы на пропуск двух відаў спорту.




***— Але досвед удзелу ў такіх гульнях не першы?***

— У канцы 2017 года мы ўпершыню заявіліся на Сусветныя паліцэйскія гульні, але ўдзельнічалі толькі ў двух відах — у практычнай стральбе і дзюдо. Ды і тое стралкі тады не трапілі на п'едэстал гонару. А вось дзюдаісты прынеслі «серабро». І за гэты час мы зрабілі адбор сярод міліцыянераў пры дапамозе цэлай сістэмы ўнутраных чэмпіянатаў. Хто аказаўся мацнейшы — з тым і працавалі каля дзевяці месяцаў.

## АБМЕН ДОСВЕДАМ

**Начальнік спартыўнай каманды МУС Беларусі падпалкоўнік міліцыі Сяргей ВАЛОШЫН** зазначае, што спорт і служба — цалкам сумяшчальныя.



— Перш чым пачаць трэніроўкі, складаецца адмысловы графік, які дазваляе максімальна развесці работу і спорт, каб не было адрыву ад службы. І вось што яшчэ адметна: на любых міжнародных спаборніцтвах заўжды прысутнічае таварыскі настрой. Кожны з удзельнікаў выконвае ў сваёй дзяржаве адну і тую ж функцыю аховы грамадзян і парадку. Таму пры неабходнасці выступоўцы з іншых краін заўжды дапамагаюць адно аднаму і дзеляцца, калі трэба, спартыўным інвентаром. Асабліва гэта заўважна ў стралкоў.

Але чэмпіянаты такога ўзроўню — гэта магчымасць не толькі паказаць свае ўменні, але і сёе-тое запазычыць з досведу замежных калег.

— Напрыклад, у Мілане мы звярнулі ўвагу на асаблівасці службы тамтэйшых карабінераў, — працягвае Віктар Янчуковіч. — На тое, як яны суправаджаюць спартсменаў, ахоўваюць парадак, носяць табельную зброю, якімі сродкамі абароны карыстаюцца... Цікавасць выклікала тое, што яны шырока карыстаюцца электрашокерамі.

## ВЯЛІКІЯ БАТАЛІІ МІНІ-ФУТБОЛА

Чамусьці ў праграме Сусветных паліцэйскіх гульняў не знайшлося месца для міні-футбола. Нашы міліцыянеры традыцыйна прымаюць удзел у міжнародным чэмпіянаце, які праходзіць у Нідэрландах яшчэ з пачатку 1980-х гадоў.

— Пры гэтым шэсць разоў мы вярталіся з такіх турніраў з узнагародамі, — згадвае Віктар Янчуковіч. — Тройчы іх выйгравалі, яшчэ адзін раз спыніліся на «серабры» і двойчы заваявалі «бронзу». Але турнірная сетка вельмі напружаная. Каб трапіць у фінал, трэба правесці 15-16 сустрэч за тыдзень. Гульні ідуць з ранку і да позняга вечара.



Сёлетні турнір праходзіў у спартыўных залах трох нідэрландскіх гарадоў — Ліхтэнфорда, Грунло і Эйбергена. 54 краіны выставілі больш за дзве сотні каманд. МУС Беларусі прадстаўлялі дзве — у старэйшай узроставай катэгорыі (35+) і без абмежавання ўзросту. Апошняя і прынесла сёлета «серабро» ў нашу скарбонку. Ды і тое фінальны матч дайшоў да серыі пенальці, бо асноўны і дадатковы час скончыліся з лікам 0:0.

## З ПРЫЦЭЛАМ НА ТОКІА

З 24 ліпеня да 9 жніўня ў японскай сталіцы пройдуць XXXII летнія Алімпійскія гульні. Цяпер нацыянальная зборная Беларусі паступова камплектуецца спартсменамі, якія адправяцца змагацца за ўзнагароды ў Краіну ўзыходзячага сонца. Не застаецца ўбаку ад гэтай пачэснай падзеі і Міністэрства ўнутраных спраў.



Дзюдаістка Святлана ЦІМАШЭНКА заваявала «золата» ў Мілане.

— У нашай спартыўнай камандзе сем чалавек ужо адабраліся на Гульні, — кажа Сяргей Валошын. — У веславанні на байдарках і каноэ выступяць Марына Літвінчук, Алег Юрэня, Вольга Худэнка і Надзея Папок. У Токіа дакладна паедуць лёгкаатлетка Хрысціна Цімановская, кідальніца молата Ганна Малышчык і барэц Ірына Курачкіна. Яшчэ 17 чалавек — гэта прэтэндэнты з рэальнымі шанцамі трапіць на галоўны старт чатырохгоддзя. Хтосьці адбярэцца туды па рэйтынгу, а нехта ў чаканні персанальнай ліцэнзіі.

## ХТО САМЫ ХУТКІ?

Днямі стала вядома, што налета ў кастрычніку Мінск прыме XVI чэмпіянат Еўропы па лёгкаатлетычным кросе, які праводзіцца раз на чатыры гады пад эгідай Еўрапейскага спартыўнага саюза паліцэйскіх. У парку «Сонечная даліна» пройдуць дванаццацікіламетровы забег для мужчын і васьмікіламетровы для жанчын. Для гасцей нашай краіны запланавана вялікая экскурсійная праграма. Медальныя шанцы, на думку Віктара Янчуковіча, у нашых спартсменаў ёсць. Дык няхай у іх усё складзецца як мае быць!



Дэлегацыя Беларусі на III Сусветных паліцэйскіх гульнях.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
**Фота дадзена МУС.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 30 января 2020 года проводит 2-й открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности**

| Номер лота | Наименование техники | Местонахождение объекта | Начальная цена продажи (бел. руб.) | Сумма задатка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|
| 14 | Грузовой бортовой Урал-4320-0010-01 ш. 171098 дв. 510765 1991 г. *4 кат. 108 000 км* | г. Береза в/ч 23324 | 8 300,00 | 1 660,00 |
| 15 | Грузовой бортовой Урал-43202-0011-01 ш. L0141995 дв. 566681 1990 г. *5 кат. 63 176 км* | г. Старые Дороги в/ч 48668 | 8 200,00 | 1 640,00 |
| 16 | Седельный тягач КамАЗ-5410 ш. 128689 дв. 743480 1985 г. *3 кат. 105 932 км* | г. Старые Дороги в/ч 48668 | 7 800,00 | 1 560,00 |
| 17 | Седельный тягач КрАЗ-260В ш. 535794 дв. 941791 1985 г. *4 кат. 50 325 км* | г. Старые Дороги в/ч 48668 | 8 800,00 | 1 760,00 |
| 18 | Седельный тягач КрАЗ-260В ш. 541252 дв. 953286 1985 г. *4 кат. 49 042 км* | г. Старые Дороги в/ч 48668 | 7 500,00 | 1 500,00 |
| 19 | Седельный тягач КрАЗ-260В ш. 541936 дв. 945792 1985 г. *4 кат. 11 095 км* | г. Старые Дороги в/ч 48668 | 8 000,00 | 1 600,00 |
| 20 | Специальный автомобиль КамАЗ-4310 с кузовом-фургоном КМ-4310 в составе: кузов-фургон КМ-4310 № 6409 1981г. *4 кат.;* автошасси КамАЗ-4310 ш. 020743 дв. 0923793 1981г. *4 кат. 17 509 км* | г. Осиповичи в/ч 01313 | 9 000,00 | 1 800,00 |
| 21 | Специальный автомобиль ГАЗ-66 с кузовом-фургоном К-66Н в составе: кузов-фургон К-66Н № б/н1-32377 1988 г. *4 кат.;* автошасси ГАЗ-66 ш. 0529432 дв. 27687 1988 г. *4 кат. 4 955 км* | г. Осиповичи в/ч 01313 | 3 300,00 | 660,00 |
| 22 | Специальный автомобиль ГАЗ-66 с кузовом-фургоном К-66Н в составе: кузов-фургон К-66Н № 224282 1982 г. *4 кат.;* автошасси ГАЗ-66 ш. 0345995 дв. 04041 1982 г. *4 кат. 5 230 км* | г. Осиповичи в/ч 01313 | 3 300,00 | 660,00 |
| 23 | Гусеничное шасси МТ-Лбу (демилитаризованное) № 10Е8907022 в составе: гусеничное шасси МТ-Лбу (демилитаризованное) ш. 10Е8907022 дв. 8915136 1989 г. *4 кат.* 6 499 км; электроагрегат АД16У-Т/400 1ВП № БА3658СМВИ1989 г. *4 кат.* 626 м/ч | г. Осиповичи в/ч 01313 | 80 000,00 | 16 000,00 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж **30 января 2020 г. в 10.30.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток, гарантийный депозит и подавшие заявление на участие в аукционе, соглашение, учредительные и другие необходимые документы до **15.00 27 января 2020 года**.

Заключительная регистрация участников аукциона будет производиться **30 января 2020 г. с 9.00 до 9.45.**

**Победитель аукциона обязан:**

1. Заключить договор купли-продажи не позднее 3 банковских дней с момента проведения аукциона.
2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение **5** банковских дней для резидентов Республики Беларусь и **10** банковских дней для нерезидентов Республики Беларусь со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток, указанный в таблице, а также гарантийный депозит в размере 300,00 белорусских рублей за участие по каждому лоту и денежные средства за выигранное имущество перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: белорусские рубли — р/с BY51BPSB30121078830299330000, российские рубли — р/с BY05BPSB30121078830876430000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-СберБанк», г. Минск, ул. Чкалова, 18, корп. 1, код BPSBBY2X, УНП 101099370, ОКПО 37401662 Корреспондент-Сбербанк России г. Москва № корсчета 30111810100000000090. Реквизиты банка: БИК 044525225 ИНН 7707083893 к/с в ОПЕРУ Московского ГТУ Банка России № 30101810400000000225. **Без НДС**. **Справки по тел./факсу (017) 398 05 41.**

## ОБЪЯВЛЕНИЕ об электронных торгах

Государственное предприятие «БелЮрОбеспечение» объявляет о проведении электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Дятловоремстрой», находящегося в г. Дятлово:

лот № 4. 2020.01.00043: станок токарно-винторезный 1А62, год выпуска не установлен, начальной стоимостью 1300,00 бел. руб.;

лот № 4. 2020.01.00044: грузовой специальный автокран ЗИЛ 133ГЯ, 1990 г. в., начальной стоимостью 4000,00 бел. руб.

**Торги будут проведены 23.01.2020 (9.00—18.00)** на сайте e-auction.by.

Задаток — 10 процентов от стоимости лота — зачисляется до 16.00 22.01.2020 на счет ОПИ ГУЮ Гродненского облисполкома, р/с BY70 AKBB 3642 9050 0408 7400 0000, филиал № 400 Гродненского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк», код AKBBBY21400, УНП 500037201.

Подробная информация размещена на сайте e-auction.by в разделе «Аукционы».

УНП 192821149

## «Организатор торгов: управляющий ООО «Доспех-Спецодежда» — ЧП «БелАнтикризисГрупп» (220131, г. Минск, а/я 185, тел. 8029-119-86-66)

**Дата и место проведения торгов:** 23.01.2020 в 15.00 по адресу: г. Минск, 4-й переулок Кольцова, д. 51, оф. 618.

**Сведения о продавце: ООО «Доспех-Спецодежда» (**Минская обл., Минский р-н, Папернянский с/с, с/с Папернянский, 45/1, район д. Дубовляны, Таможенный терминал и складская база, здание АБК, 1-й этаж, пом. 71).

**Сведения о предмете торгов, начальная цена предмета торгов. Лот № 1:** дебиторская задолженность ООО «Алвиста Групп» (УНП 191040689) в размере 62 559,00 белорусских рублей с установлением начальной цены в размере 62 559,00 белорусских рублей.

**Порядок проведения торгов.** Шаг аукциона – 5 %. Победителем торгов будет объявлен покупатель, предложивший наибольшую цену. Договор купли-продажи подписывается в 20-дневный срок с даты подписания протокола по результатам торгов. В случае признания торгов несостоявшимися продажа предмета аукциона осуществляется претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %.

Задаток 5 % от стоимости предмета торгов должен быть зачислен на расчетный счет ООО «Доспех-Спецодежда» (УНП 192632039): BY71ALFA30122194140130270000 в ОАО «Альфа-Банк», BIC: ALFABY2X.

Заявки на участие принимаются по адресу: 220131, г. Минск, а/я 185, со дня публикации объявления до 10.00 23.01.2020.

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Солигорский райагросервис» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже **здания телятника с инв. № 644/С-58283 общей площадью 1 560,1 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 625000000012004996 площадью 0,5245 га (право аренды по 03.11.2034) по адресу: Минская область, Солигорский район, Краснослободский с/с, 6А, район д. Малый Рожан (далее — объект).** *Земельный участок имеет ограничения в использовании: охранная зона электрических сетей (напряжением свыше 1000 вольт), пл. 0,0083 га; охранная зона, расположенная в придорожной полосе автодороги, пл. 0,5245 га.* Начальная цена с НДС (20 %) **– 47 640,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены **– 4 764,00** бел. руб.).

**Условия продажи:**

- поддержание надлежащего санитарного состояния недвижимого имущества и земельного участка в течение всего срока использования (эксплуатации) объекта до его сноса (гибели).

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней после дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи, на депозитный счет Министерства юстиции Республики Беларусь. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 7 (семи) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Аукцион состоится **23.01.2020** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **22.01.2020** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**

## ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

Государственное производственное объединение «Минскстрой»
220050, г. Минск, ул. К. Маркса, 13А
режим работы: с 8.30 до 17.45, перерыв 13.00—14.00,
тел.: 327-52-36, 226-03-01.

Зарегистрировано решением Мингорисполкома от 18 января 2007 г. № 140 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей № 100071325.

Сведения о жилых домах, в строительстве которых, выполняя функции заказчика, принимал участие застройщик в течение 3 лет, предшествующих опубликованию настоящей декларации, с указанием фактических сроков строительства:

- ул. Академика Высоцкого, д. 3 – 9,8 мес., ул. Героев 120-й Дивизии, д. 2 – 23,9 мес., ул. Пономарева, 9А – 22 мес., ул. Скрипникова, д. 60 – 16,5 мес., ул. Скрипникова, д. 58 – 13,0 мес., ул. Скрипникова, д. 70 – 15,5 мес., ул. Скрипникова, д. 68 – 14 мес.

Объединение осуществляет строительство объекта **«Комплексный проект застройки жилой территории в границах улиц Притыцкого, Скрипникова, Одинцова, Лобанка (микрорайон № 3)». Жилой дом № 31 по генплану.**

Свидетельство (удостоверение) № 500/1739-3151 о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права пользования на него от 27 апреля 2018 года.

Земельный участок площадью 3,5570 га.

Проектом предусмотрено строительство односекционного 19-этажного 128-квартирного жилого дома в конструкциях серии М111-90 с техническим подпольем и теплым чердаком.

Начало строительства жилого дома — 21 июня 2019 года.

Предполагаемый срок ввода в эксплуатацию в соответствии с ПОС – 5 октября 2020 года.

Проектно-сметная документация прошла в установленном порядке государственную экспертизу (заключение от 03.06.2019 № 281-15/19).

Договор строительного подряда от 20.06.2019 № 233с-06-19, генподрядчик – ОАО «МАПИД».

Договоры создания объектов долевого строительства будут заключаться на 126 квартир с гражданами, состоящими на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, преимущественно многодетными семьями, по направлениям администраций районов г. Минска с государственной поддержкой в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 04.07.2017 № 240 «О государственной поддержке граждан при строительстве (реконструкции) жилых помещений», и на 2 квартиры с медалистами XII зимних Паралимпийских игр 2018 года (далее – медалисты) без использования государственной поддержки в соответствии с решением Мингорисполкома от 02.08.2018 г. № 2547 «Об организации строительства объекта» и решением Мингорисполкома от 11.07.2019 г. № 2110 «Об изменении решения Мингорисполкома от 2 августа 2018 г. № 2547».

Предметом договора будет являться строительство жилого помещения.

Стоимость строительства 1 кв. метра общей площади жилых помещений с выполнением внутренних отделочных работ в текущих ценах для граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, составляет:

1 275,18 белорусского рубля для нормируемой площади жилого помещения;

1 980,00 белорусских рублей для общей площади жилого помещения, превышающей нормируемую.

Стоимость строительства 1 кв. метра общей площади жилых помещений с выполнением внутренних отделочных работ в текущих ценах для медалистов составляет:

1 301,55 белорусского рубля для нормируемой площади жилого помещения;

2 006,37 белорусского рубля для общей площади жилого помещения, превышающей нормируемую.

Первоначальный взнос при условии оплаты согласно графику платежей составляет 30% от стоимости квартиры, оплата должна быть произведена дольщиком в течение 20 (двадцати) банковских дней со дня регистрации в Мингорисполкоме договора создания объекта долевого строительства.

В состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое подлежит передаче в долевую собственность, входят: межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыша, технические этажи и подвал, другие места общественного пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и нежилых помещений.

Заявления о долевом строительстве жилых помещений будут приниматься (регистрироваться) через 5 календарных дней, а договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться через 7 календарных дней после опубликования настоящей декларации в кабинете 105 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13А непосредственно с гражданами, подавшими заявления либо с их представителями, действующими на основании доверенности, оформленной в установленном законодательством порядке.

Заместитель генерального директора В. А. Косовец

## ОБЪЯВЛЕНИЕ об электронных торгах

Государственное предприятие «БелЮрОбеспечение» объявляет о проведении электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего Хвалевой Елене Николаевне, находящегося в г. Гродно:

лот № 4.2020.01.00031: автомобиль «Мицубиси-Кольт», 1996 г. в., начальной стоимостью 820 бел. руб.

**Торги будут проведены 16.01.2020 (9.00 — 18.00)** на сайте e-auction.by.

Задаток — 10 процентов от стоимости лота зачисляется до 16.00 15.01.2020 на счет ОПИ Ленинского района г. Гродно, р/с BY95 AKBB 3642 9050 0521 7400 0000, ф-л 400 ОАО «АСБ «Беларусбанк», код AKBBBY21400, УНП 500037201.

Подробная информация размещена на сайте e-auction.by в разделе аукционы.

УНП 192821149

**ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении открытого аукцион на 21.01.2020 в 11.00 по адресу: 230015 г. Гродно, ул. Максима Горького, 87, каб. № 204, по продаже права заключения договора аренды недвижимого имущества сроком на пять лет для производственных целей (за исключением вредных производств), размещения офисов, складских помещений, оказания услуг. Организатор аукциона — РУП «Белтелеком» в лице Гродненского филиала, 230015 г. Гродно, ул. Максима Горького, 87**

| Адрес арендуемого имущества | № лота | Площадь, кв. м | Коэффициент от 0,5 до 3,0 | Начальная цена продажи, базовые арендные величины* | Размер задатка, базовые арендные величины* | Характеристика |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Капитальное строение, склады, 1-й этаж, часть помещения, Гродненская обл., г. Гродно, ул. Карского, д. 12 | 1 | 88,34 | 3,0 | 22,085 | 2,2085 | Площадь находится на первом этаже одноэтажного кирпичного здания во второй зоне города. В помещении имеется естественное освещение, электроснабжение. Площадь находится в удовлетворительном состоянии |

* Оплата в белорусских рублях, исходя из размера базовой арендной величины, установленной в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь на день оплаты.

Порядок проведения и оформления участия в аукционе определены Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 №1049 (в ред. постановлений Совмина от 21.06.2012 № 570, от 08.01.2013 № 16, от 12.07.2013 № 607).

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, в том числе индивидуальные предприниматели, предоставившие организатору следующие документы: представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет организатору аукциона оригинал доверенности (документ, подтверждающий полномочия должностного лица); документ, удостоверяющий личность; заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, порядком проведения аукциона; соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона; заверенную банком копию платежного документа, о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона, документ, удостоверяющий личность (для физических лиц, для представителей физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица); доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) (для представителей физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица); копию свидетельства о государственной регистрации (для индивидуальных предпринимателей и юридических лиц — резидентов Республики Беларусь), легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения (для юридических лиц — нерезидентов Республики Беларусь). Копии документов представляются без нотариального засвидетельствования.

Задаток перечисляется на субсчет BY16AKBB30120000400714000000 в филиале № 400 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Гродно, БИК AKBB BY21400 Гродненский филиал РУП «Белтелеком».

Участники аукциона уплачивают штраф в случаях, предусмотренных частью второй пункта 14 Положения о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049 (в ред. постановлений Совмина от 21.06.2012 № 570, от 08.01.2013 № 16, от 12.07.2013 № 607), в размере 15 % от начальной цены продажи соответствующего лота.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену за предмет аукциона. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на субсчет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение.

Договор аренды по результатам аукциона заключается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона и подписания протокола аукциона.

Прием документов на участие в аукционе осуществляется по адресу: 230015, г. Гродно, ул. Максима Горького, 87, каб. 407 с 23.12.2019 по 20.01.2020 включительно в рабочие дни (с 9.00 до 16.00). Документы, поданные после 16.00 20.01.2020, не рассматриваются.

**Телефоны для справок: (0152) 606805, (0152) 606804, (0152) 432571, факс (0152) 486001.**

# ВЫШЭЙШАЯ АДУКАЦЫЯ... НА ДЫСТАНЦЫІ

## Вучыцца ў зручны час, у зручным месцы, сумяшчаць вучобу, кар'еру і самарэалізацыю

**Як вы думаеце, ці трэба вышэйшай школе ўлічваць асаблівасці пакалення Z, прадстаўнікі якога пошук інфармацыі ў інтэрнэце засвоілі раней, чым лічбы і літары? Для лічбавага пакалення характэрнае кліпавае мысленне і немагчымасць сканцэнтравацца на лекцыях, дзе ўвага студэнтаў вельмі хутка пераключаецца на гаджэты... Але ў той жа час яны з задавальненнем могуць весці перапіску з выкладчыкамі з нагоды цікавых момантаў лекцыі. Неабходнасць лічбавай трансфармацыі адукацыі напрошваецца даўно. А дыстанцыйнае навучанне — гэта той трэнд, які нельга ігнараваць, бо ў процілеглым выпадку можна застацца неканкурэнтаздольнымі на рынку адукацыйных паслуг. Пра гэта ішла размова на міжнароднай канферэнцыі «Дыстанцыйнае навучанне — адукацыйнае асяроддзе XXI стагоддзя», якая прайшла ў БДУІР.**

### Сур'ёзны выклік

— Развіццё дыстанцыйнай адукацыі цягне за сабой вялікі пласт міждысцыплінарных даследаванняў, звязаных як з распрацоўкай і развіццём інфармацыйных сістэм, камунікацыйных тэхналогій, так і з узаемадзеяннем у сістэме «чалавек — камп'ютар», — падкрэслівае **рэктар БДУІР Вадзім БОГУШ.** — Таму было б памылкай засяроджваць нашу ўвагу толькі на тэхнічных і тэхналагічных рэчах. Нельга ўпускаць з віду і сацыяльны эфект ад укаранення новых адукацыйных тэхналогій. У адным амерыканскім універсітэце дaручылі штучнаму інтэлекту кансультаваць студэнтаў. Як вы думаеце, чым скончыўся эксперымент? 60 працэнтаў студэнтаў не зразумелі, што іх кансультаваў не чалавек.

Высокі тэмп жыцця, неабходнасць пастаянна павышаць кваліфікацыю і развіццё камп'ютарных тэхналогій прывялі ў апошняе дзесяцігоддзе да масавага распаўсюджвання анлайн-навучання, прычым размова ідзе не толькі пра кароткатэрміновыя курсы. Сёння ёсць магчымасць атрымаць анлайн і паўнавартасную вышэйшую адукацыю.

У 2017 годзе на спецыяльных адукацыйных платформах было размешчана больш за 9000 курсаў ад 800 універсітэтаў свету. У ЗША трацiна студэнтаў зарэгістраваная хоць бы на адзін анлайн-курс. 80 працэнтаў вышэйшых навучальных устаноў у гэтай краіне забяспечваюць поўную або частковую анлайн-адукацыю. Напрыклад, Бостанскі ўніверсітэт прапануе дыстанцыйнае навучанне на узроўнях бакалаўрыяту, магістратуры і нават дактарантуры

Некаторыя лічаць, што адукацыя можа быць альбо вочнай, альбо анлайн. Насамрэч, ёсць магчымасць камбінаваць розныя формы, спалучаць тэхналогіі ў залежнасці ад пастаўленых задач.

— Цяпер адбываецца глабальная лічбавая трансфармацыя грамадства. Пры гэтым тэхналогіі, рытм жыцця і дзелавой актыўнасці настолькі паскорыліся, што ніякая аднойчы атрыманая ва ўстанове адукацыі спецыяльнасць не дае гарантыі кавалка хлеба на ўсё астатняе жыццё, — разважае **прарэктар па вучэбнай рабоце БДУІР Валерый ПРЫТКОЎ.** — Гэта раней адукацыя атрымлівалася «раз і назаўжды». А цяпер набыты ў ВНУ набор кампетэнцый «згарае» на працягу трох-чатырох гадоў, і трэба быць гатовым да таго, што прыйдзецца як мінімум два-тры разы за сваё жыццё радыкальна змяніць прафесію або кола сваіх абавязкаў. Невыпадкова была сфармуляваная канцэпцыя навучання на працягу ўсяго жыцця (life-long learning).

Такім чынам агульная колькасць людзей, якія на розных жыццёвых этапах будуць мець патрэбу ў той ці іншай адукацыі, тых ці іншых ведах, узрасце шматразова. Асабліва гэта актуальна для прамысловага сектара, паколькі ў высокаканкурэнтным асяроддзі кампаніі вымушаны пастаянна перанавучаць персанал з мэтай асваення новых інструментаў. Больш за тое, колькасць тых,



хто мае патрэбу ў перанавучанні, будзе расці непрапарцыянальна хутчэй, чым колькасць выкладчыкаў, і цягнуць за сабой значнае павелічэнне на іх вучэбнай нагрузкі. Гэта вельмі сур'ёзны выклік сістэме адукацыі ў цэлым, і без выкарыстання новых эфектыўных метадаў навучання тут не абысціся. Адным са спосабаў пераадолення такога разрыву з'яўляецца выкарыстанне дыстанцыйных адукацыйных тэхналогій, якія дазваляюць маштабіраваць працэс навучання.

Так, масавы адкрыты анлайн-курс павышанай складанасці Масачусецкага тэхналагічнага інстытута па электрычных ланцугах і электроніцы ў першы год пасля яго запуску вывучалі 155 тысяч слухачоў са 162 краін. Цалкам завяршылі навучанне з іх толькі 7200. А ў 2019 годзе колькасць слухачоў дасягнула ўжо 500 тысяч. Платформы масавых адкрытых анлайн-курсаў дазваляюць навучацца ў зручны час у зручным месцы, а іх выкарыстанне ў вучэбным працэсе істотна павышае гнуткасць і стварае перадумовы для рэалізацыі індывідуальных адукацыйных траекторый. Платформаў такога тыпу налічваецца ўжо некалькі дзясяткаў (сярод іх Coursera, Udacity, EdX і іншыя), і пастаянна з'яўляюцца новыя.

### Прыбытковая індустрыя

На канферэнцыі ў БДУІР была агучана наступная інфармацыя: агульны аб'ём даходу ад адукацыйных рэсурсаў у свеце склаў у 2018 годзе больш за 4,5 трлн долараў. Па аналітычных прагнозах, у найбліжэйшыя гады гэта лічба павінна ўзрасці да 7 трлн долараў. А доля анлайн-адукацыі ў ім складае каля 3 %, або 165 млрд долараў. Штогадовы прырост прыбытку ад дыстанцыйнай адукацыі — прыблізна 5 %. Абапіраючыся на гэты паказчык, можна скласці прагноз павелічэння даходу ад анлайн-адукацыі на найбліжэйшыя пяць гадоў, атрымаўшы ў 2023 годзе лічбу ў 210 млрд долараў. Дыстанцыйная адукацыя штогод становіцца ўсё больш папулярнай і запатрабаванай (анлайн-навучанне істотна скарачае фінансавыя выдаткі як саміх студэнтаў, так і ўніверсітэтаў), а гэта, у сваю чаргу, прыцягвае да яе вялікую колькасць інвестараў, ператвараючы ў прыбытковую індустрыю.

**Ці будуць беларускія ВНУ канкурэнтаздольныя на сусветным рынку паслуг?**

Наша вышэйшая школа знаходзіцца на перадавых пазіцыях у галіне праграмнай інжынерыі, камп'ютарных сетак, аперацыйных сістэм і баз даных. Такая сітуацыя стварае спрыяльнае асяроддзе для развіцця дыстанцыйных адукацыйных тэхналогій у краіне.

БДУІР развівае дыстанцыйнае навучанне з 2002 года. Цяпер на гэтай форме ва ўніверсітэце навучаецца 590 студэнтаў па дзесяці спецыяльнасцях. Таксама на ўзроўні ўніверсітэта арганізавана вывучэнне асобных дысцыплін навучальных планаў з выкарыстаннем дыстанцыйных тэхналогій. Такой магчымасцю студэнты ўсіх факультэтаў БДУІР і знешнія слухачы скарысталіся на працягу навучальнага года 2831 раз.

Валерый Прыткоў адзначае, што развіццё дыстанцыйнай адукацыі немагчымае без стварэння ва ўніверсітэце адпаведнай IT-інфраструктуры: сродкаў камп'ютарнай і тэлекамунікацыйнай тэхнікі, цэнтраў апрацоўкі даных, праграмнага забеспячэння, камп'ютарных сетак, баз даных, высакахуткаснага інтэрнэта і г. д. У прыватнасці, IT-інфраструктура БДУІР уключае карпаратыўную сетку, якая аб'ядноўвае больш за 2600 камп'ютараў. Яе функцыянаванне падтрымліваюць 18 сервераў і больш за 270 камутатараў. Зону Wi-Fi падтрымліваюць 60 пунктаў доступу, пры гэтым 20 з іх уведзеныя за апошні год, а працягласць оптавалаконных ліній карпаратыўнай сеткі складае 9 кіламетраў. Але наяўнасці адпаведнай інфраструктуры недастаткова — яе павінны суправаджаць высокакваліфікаваныя спецыялісты...

**Агульная колькасць людзей, якія на розных жыццёвых этапах будуць мець патрэбу ў той ці іншай адукацыі, тых ці іншых ведах, узрасце шматразова. Асабліва гэта актуальна для прамысловага сектара.**

Да іншых важных праблем, якія не спрыяюць далейшаму развіццю дыстанцыйнай адукацыі, Валерый Прыткоў адносіць і невысокую якасць навучальных матэрыялаў, уключаючы іх хуткае старэнне па шэрагу прадметных абласцей, і невысокую хуткасць распрацоўкі якаснага кантэнту. **Дыстанцыйная форма дыктуе новыя патрабаванні: наяўнасць відэакантэнту, прычым у фармаце кароткіх тэматычных ролікаў, модульнае разбіццё курсу, тэсціраванне пасля праходжання кожнага модуля, наяўнасць сеткавых сродкаў узаемадзеяння як з іншымі навучэнцамі, так і з выкладчыкам (форумы і г. д.).** Але выкладчыкаў, гатовых да распрацоўкі навучальных матэрыялаў у новым фармаце, пакуль не хапае. Да таго ж і кошт іх распрацоўкі «кусаецца». Прадстаўнік кампаніі EPAM назваў наступную лічбу: адна хвіліна відэароліка каштуе прыкладна 100 долараў.

У бягучым навучальным годзе ў БДУІР рэалізуецца эксперыментальны праект «Апрабацыя дыстанцыйнай формы атрымання адукацыі па IT-спецыяльнасцях у рамках трансфармацыі БДУІР у «Лічбавы ўніверсітэт», вынікі якога дазволяць закласці аснову для пераходу да змешанага навучання і выкарыстанню дагавораў публічнай аферты па аказанні адукацыйных паслуг, якія актыўна выкарыстоўваюцца на большасці масавых адукацыйных анлайн-курсаў.

Увогуле, шэраг праблем нарматыўна-прававога характару, якія б спрасцілі далейшае распаўсюджванне дыстанцыйнай формы навучання і спрыялі пашырэнню экспарту дыстанцыйных адукацыйных паслуг, па-ранейшаму чакаюць свайго вырашэння. **Канкрэтныя «правілы гульні» не ўстаноўлены, а зона нявызначанасці — занадта вялікая. Пакуль што кожны крок у развіцці дыстанцыйных тэхналогій у нашай краіне — гэта нейкае ўнікальнае дзеянне.** Вядома, што ў новай рэдакцыі Кодэкса «Аб адукацыі» дыстанцыйную форму атрымання адукацыі прапісуць асобна, бо зараз яна з'яўляецца толькі відам завочнай.

### Самадысцыпліна і адказнасць

Між іншым, удзельнікі канферэнцыі з Казахстана паведамілі, што ў іх краіне з 1 студзеня 2019 года завочнае навучанне ва ўніверсітэтах краіны было спыненае — з мэтай павышэння якасці адукацыі. Аналіз паказаў, што так званыя «завочнікі» асвойвалі ўсяго 65 працэнтаў ад аб'ёму, які даваўся студэнтам вочнай формы навучання. Цяпер вышэйшую адукацыю ў Казахстане можна будзе атрымаць па сістэме part-time з выкарыстаннем дыстанцыйных тэхналогій навучання і гнуткага графіку, пры якім частка курсаў праходзіць па вечарах і ў выхадныя дні. Акрамя таго, быў выключаны тэрмін, які даецца на засваенне адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі. Адпаведна, ВНУ змогуць распрацоўваць гнуткія і інтэграваныя адукацыйныя праграмы непасрэдна з улікам вынікаў навучання кожнага са студэнтаў, якія прадугледжваюць завяршэнне праграмы бакалаўрыяту ў паскораным рэжыме. Але, напрыклад, выпускнікам школ нельга навучацца дыстанцыйна. Заканадаўства выключае такую магчымасць на базе праграмы агульнай сярэдняй адукацыі. У выпадку з выпускнікамі каледжаў і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў кожная ВНУ сама вызначае магчымасць навучання на дыстанцыі.

Казалі на канферэнцыі і пра тое, што многія фірмы і ўстановы пакуль яшчэ не прызнаюць анлайн-навучанне. І калі гутарку па вакансіі праходзяць два кандыдаты, адзін з якіх вучыўся ва ўніверсітэце на вочнай ці завочнай форме навучання, а другі — дыстанцыйна, то часта перавага аддаецца прэтэндэнту, які навучаўся па звыклай для работадаўца сістэме.

А вось яшчэ інфармацыя для роздуму: у 2015 годзе група даследчыкаў з Ізраіля вывучала паводзіны больш чым 13 000 студэнтаў, якія запісаліся на дыстанцыйны курс па нанатэхналогіях. З іх толькі 4 % дайшлі да канца. Аказалася, што ў тых, хто не скончыў курс, «кульгае» саматыватацыя і ўпэўненасць у сваёй здольнасці асвоіць дысцыпліну. Усе гэтыя праблемы звязаны з адсутнасцю ў адукацыйным працэсе чалавека. Мы прызвычаіліся да настаўнікаў, аднакласнікаў і аднакурснікаў, да элементаў спаборніцтва ў вучобе і асабістых стасункаў.

Навучанне анлайн насамрэч з'яўляецца рацыянальным рашэннем для людзей, у якіх фізічна не хапае часу на наведванне ўніверсітэта, якія хочуць сумяшчаць вучобу з кар'ерай, вандроўкамі і самарэалізацыяй. Акрамя таго, такая форма адукацыі практычна адзіная магчымасць для людзей з абмежаванымі магчымасцямі засвоіць спецыяльнасць і сацыялізавацца ў грамадстве. Але пры гэтым трэба мець на ўвазе, што атрымаць прафесію дыстанцыйна не атрымаецца, не валодаючы такімі якасцямі, як самадысцыпліна, уседлівасць, працавітасць, уважлівасць і адказнасць, бо побач не будзе выкладчыка, гатовага аказаць падтрымку, і перад якім студэнту не будзе сорамна. Таму варта ўзважваць усе «за» і «супраць». А спецыяльнасці, якія патрабуюць больш практычных ведаў, чым тэорыі, увогуле не могуць быць атрыманы на адлегласці.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Асоба

## Канстанцін СЕЛІХАНАЎ:

# «Сучаснае мастацтва — складанае па азначэнні, яно не з'яўляецца крыніцай радасці»

**Праект, што прадстаўляў Беларусь на сёлетняй Венецыянскай біенале — найпрэстыжнейшай міжнароднай выстаўцы сучаснага мастацтва, — з 18 снежня можна ўбачыць у Мінску. Беларускі адказ на дэвіз выстаўкі, які гэтым разам стала пажаданне «Каб вы жылі ў цікавыя часы», паказвае цэнтр сучасных мастацтваў. Конкурсам у Міністэрстве культуры, што вызначае будучага ўдзельніка біенале, была абраная канцэпцыя куратара Вольгі Рыбчынскай і мастака і скульптара Канстанціна Селіханава. Некалькі кампазіцый, дзе фігуры чалавека стасуюцца з пэўным атрыбутам — тэлевізарам, альбо шклянкамі з малаком на падносе, альбо нечым іншым, — падпарадкоўваюцца агульнай ідэі, і ўсё гэта — «Exit», альбо «Выхад», альбо нават «Выйсце». Міжнародны агляд мастацтва адгрымеў — «венецыянская» экспазіцыя прыехала ў Мінск, з нагоды чаго мы зайшлі да Канстанціна Селіханава і даведаліся пра эканоміку і практыку падрыхтоўкі да біенале, на якія з'явы рэчаіснасці адказвае яго праект і ў чым заключаецца беларуская трывога.**



***— Вы ўдзельнічалі ў Венецыянскай біенале двойчы, толькі гэтым разам — у якасці адзінага мастака-аўтара. Ці былі адрозненні сёлетняй падрыхтоўкі ад падрыхтоўкі ў 2009-м?***

— Тэхнічна ўсё было прыкладна гэтаксама, то-бок складана. Удзел у Венецыянскай біенале патрабуе намаганняў не толькі мастака — павінен існаваць асобны аддзел, які б займаўся выключна выстаўкай. Да буйнога мерапрыемства па сучасным мастацтве, як і ў сферах кіно ці класічнай музыкі, патрэбна сур'ёзная падрыхтоўка, гэта не так проста, як мяркуюць: «Ну што такое зрабіць выстаўку? — падумаеш, павесіць дзесяць карцін, сказаць нейкую прамову». Свет даўно праехаў гэты этап, апошні раз такі падыход меў месца ў канцы 1940-х, з тых часоў галіна мастацтва хутка развівалася, але інерцыя дзенідзе захоўваецца дагэтуль. Праўда, і ў нас нешта мяняецца, асабліва ў форме, хоць і не вельмі — у ідэях. Каб фармуляваць ідэі, трэба, каб грамадства стала больш складанае, каб мы гаварылі не толькі пра забаву і прапагандавалі не толькі фестываль народнага танца альбо эстрадны канцэрт, для якіх грошы знаходзяцца адразу. Сучаснае мастацтва — складанае па азначэнні, яно не з'яўляецца крыніцай радасці. Дык вось і тады, і цяпер падрыхтоўка да біенале была няпростая, але мне здалося, што сёлета Міністэрства культуры было больш зацікаўленае і адкрытае, то-бок пазітыўныя перамены ўсё ж ёсць.

***— Вы сказалі, што павінен існаваць асобны аддзел, які б займаўся падрыхтоўкай да біенале. Што мы страчваем з-за яго адсутнасці?***

— Мы заўсёды крыху спазняемся. Падрыхтоўка да біенале мае на ўвазе не толькі стварэнне твора, але і, напрыклад, пошук прыдатнага памяшкання, прыцягненне спонсараў, страхаванне і гэтак далей. Вялікая работа патрабуецца яшчэ да таго, як за справу бярэцца мастак. Праект выбіраецца праз конкурс: яго варта было б арганізоўваць раней, тады ў аўтара было б больш часу, каб выбудаваць экспазіцыю і трансфармаваць ідэю з улікам павільёна. У Францыі, Расіі альбо Венесуэлы пастаянныя павільёны: аўтары ведаюць, якой прасторай валодаюць, — адпаведна, ім значна прасцей рыхтавацца. Я кажу пра тэхнічны працэс, таму што мастаку часта даводзіцца займацца не ўласцівымі яму функцыямі, працэнтаў сорак часу мы робім тое, што не павінны.

***— Як дорага краіне абыходзіцца ўдзел у Венецыянскай біенале?***

— Дакладна я не ведаю, прыкладна 50 тысяч еўра — гэта гучыць грозна, але насамрэч з'яўляецца даволі сярэдняй лічбай, тыя ж літоўцы выдаткоўваюць на свой удзел у два разы больш.

***— Пляцоўкай праекта «Выхад» у Мінску стаў Цэнтр сучасных мастацтваў: наколькі яго антураж адпавядае антуражу, у якім экспазіцыя была прадстаўлена на Венецыянскай біенале?***

— Канешне, «Выхад» у Венецыі адрозніваецца ад «Выхаду» ў Мінску, хоць і нязначна. Любая экспазіцыя мяркуе нейкі кантэкст, таму пры яе падрыхтоўцы ўлічваеш наваколле, у якое яе «пагружаеш». Пры мантажы гэтай выстаўкі мы мусілі «змагацца з прасторай», бо яна нам не зусім падыходзіла і першапачатковая праект рабіўся менавіта пад памяшканне, якое мы знайшлі ў Венецыі, — не сказаць, каб цясніну, але нешта выцягнутае і замкнутае. Да таго ж гэта была прастора, у якую ты трапляеш адразу з вуліцы, чаму добра адпавядала слова «выхад». У Мінску з праектам адбылася пэўная трансфармацыя, і адрозненне, у першую чаргу, у маштабе: мы павінны былі ўлічваць, што гэта Цэнтр сучасных мастацтваў з яго сістэмай калідораў і былымі майстэрнямі, таму захапілі частку калідора з намёкам на тое, што гісторыя гэтага памяшкання іншая. Але па вялікім рахунку мы зараз гаворым пра дэкаратыўныя рэчы, якія не ўплываюць на сутнасць.

***— А як вы знайшлі і па якіх крытэрыях выбралі памяшканне ў Венецыі?***

— Усё вельмі проста: па выключна грашовым фактары. Выбар быў вельмі невялікі, а цэны вельмі высокія, мы заняліся пошукам позна, дакладней, пазнавата, і памяшканні, што нам падабаліся, былі дарагія, а бюджэт — абмежаваны. У выніку з лакацыяй усё атрымалася нядрэнна, нават вельмі сімпатычна: мы аказаліся акурат паміж дзвюма галоўнымі пляцоўкамі — садамі Джардзіні і Арсеналам, дарога паміж імі праходзіла праз наш павільён, таму ў нас было шмат наведвальнікаў і адмысловая займаць рэкламай не было неабходнасці.

***— Атрыбуты, якія суправаджаюць чалавека ў праекце «Выхад», больш-менш універсальныя, то-бок іх нельга аднесці да канкрэтнага стылю альбо культуры, апроч аднаго — гранёнай шклянкі. Чаму менавіта яна?***

— Калі казаць проста, гэтым праектам я ў першую чаргу расказваю пра сябе — а мая асабістая гісторыя ёсць гісторыя краіны, — і тое прakлицце «жыць у цікавыя часы»: я нарадзіўся ў Савецкім Саюзе, перажыў перабудову і распад СССР, я служыў у савецкім войску, помню Чарнобыль і падзенне Берлінскай сцяны. Мы гэтыя цікавыя часы працягваем пражываць, то-бок дагэтуль не вярнуліся да дабратворнага спакою і знаходзімся ў стане пошуку выхаду, да чаго і адсылае назва экспазіцыі. А праз гранёныя шклянкі мы ўспамінаем падвячоркі ў дзяцінстве і абсалютна высакародныя спробы ўсіх накарміць і з адной каструлі размеркаваць аднолькавыя порцыі. У кожнай з аб'яднаных у праекце работ, між іншым, ёсць свая назва. Тыя скрыні — гэта «Пасылка», а ў стане пасылкі, быццам нехуды трэба з'язджаць, а прыехаўшы, усё роўна не знайсці жаданага, сёння знаходзяцца многія з нас. Альбо, напрыклад, «Малітва» — чалавек глядзіць на неонавы надпіс быццам у іншы цудоўны свет, але не бачыць яго, таму што свет гэты — так сабе, падмена рэальнасці, наша любімая «невыносная лёгкасць быцця». І святло неону падмяняе нейкае іншае важнае святло.

***— Гэта нагадала мне некаторыя сучасныя кітайскія фільмы, дзе на фоне святлівых, яскравых, забаўляльных рэчаў і пад адпаведныя гукі цацак і ігральных аўтаматаў адбываюцца трагедыі.***

